Реализация данных направлений профилактики агрессивного поведения позволяет изменить ситуацию подростка в семье и в школе; нейтрализовать негативные факторы, поступающие из внешней среды. Теория и практика показывают, что специально организованная программа профилактических занятий может ослабить и преодолеть поведенческие расстройства у подростков [3].

Список использованных источников

1 Бэрон, Р., Ричардсон Д. Агрессия / Р. Бэрон, Д. Ричардсон. – СПб: Питер, 2009. – 325 с.

2 Бандура А., Уолтерс Р. Подростковая агрессия / А. Бандура, Р. Уолтерс. – М.: ЭКСМО-Пресс, 2009. – 512 с.

3 Семенюк, Л. М. Психологические особенности агрессивного поведения подростков и условия его коррекции / Л. М. Семенюк. – М., 1996.

## *ВЫКАРЫСТАННЕ МУЗЫКІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ І ЯЕ РОЛЯ Ў РАЗВІЦЦІ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ*

**КРУК Б.А., БОГДАН А.І.**

*УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І.П.Шамякіна»*

*г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя. Артыкул прысвечаны праблеме развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў на ўроках літаратурнага чытання. Сродкам развіцця дзіцячага ўяўлення, успрымання і асэнсавання ідэйнага зместу мастацкага твора, развіцця творчых здольнасцей разглядаецца музычны твор.

Ключавыя словы: ідэйны змест, ілюстраванне, драматызацыя, мастацкі вобраз, музычны твор, творчыя здольнасці.

Выкарыстанне музыкі на ўроках літаратурнага чытання займае значнае месца,бо гэта адзін з важнейшых сродкаў фарміравання творчых здольнасцей і эстэтычнага выхавання дзяцей. Музычныя фрагменты неабходны для абуджэння эмацыянальнага ўспрымання школьнікаў, для больш глыбокага ра-

зумення пачуццяў і ідэалаў герояў літаратурных твораў. Творча і эмацыянальна настроены вучань больш глыбока адчувае і разумее прачытаны твор, яго змест і вобразы. Мелодыя дапамагае малодшым школьнікам лепш зразумець аўтарскую ідэю, закладзеную ў мастацкі твор, раскрыць характар галоўнага героя.

На думку многіх вучоных, у вучэбнай дзейнасці патрэбна выкарыстоўваць розныя стылі музыкі. Але не ўсе, а толькі тыя, што станоўча ўплываюць на настрой школьнікаў. Вядома, што класічная музыка дапамагае раскрыцца дзіцячаму ўяўленню. Праслухоўванне вясёлай музыкі можа выклікаць станоўчыя эмоцыі. Энергічная музыка ўздзейнічае на псіхіку дзіцяці і дапамагае змяніць смутак на радасць. Спакойная і плаўная музыка дазваляе засяродзіцца на чым-небудзь, супакоіцца, спакойная інструментальная музыка дапаможа стварыць добры настрой і аптымізаваць дзейнасць навучэнцаў.

Музыка можа выкарыстоўвацца на розных этапах працы з мастацкім тэкстам і з рознай мэтай. Выкарыстанне музычных твораў і іх фрагментаў дазваляе настаўніку:

а) стварыць адпаведны настрой і падрыхтаваць вучняў да эмацыянальнага ўспрымання твора;

б) суаднесці змест мастацкага твора з музычным, параўнаць іх, знайсці тое, што іх аб’ядноўвае і адрознівае;

в) развіваць адчуванне сувязі паміж музычным і мастацкім творамі;

г) правесці параўнанне (супастаўленне) музыкі і мастацкага твора.

Музычны твор на ўроках літаратурнага чытання можа выкарыстоўвацца:

а) у якасці своеасаблівага музычнага падарунка для вучняў;

б) як практыкаванне рэфлексійнага характару;

в) для развіцця ўмення выяўляць агульны настрой твораў;

г) як своеасаблівы зачын да раздзела і асобнага мастацкага твора [1, с. 96].

Праслухоўванне музыкі з’яўляецца добрым сродкам падрыхтоўкі вучняў да ўспрымання твораў значнага эмацыянальнага зместу. Вялікія магчымасці ў гэтым плане маюць музычныя творы і ўрыўкі, якія выкарыстоўваюцца перад чытаннем мастацкіх твораў аб прыродзе, гістарычных тэкстаў, вершаў, казак.

У 2 класе навучэнцам можна прапанаваць праслухаць галасы птушак пры знаёмстве з вершамі Я. Коласа “Адлёт жураўлёў” [2, с. 15], В. Жуковіча “Птушыная мова” [2, с. 71]. Гэта дазволіць эмацыйна настроіць вучняў да ўспрымання тэксту, удасканальваць уменне вызначаць настрой музычнага і паэтычнага твора.

Можна выкарыстоўваць музычнае суправаджэнне пры знаёмстве з вершам Н. Галіноўскай “Размова сняжынак” [2, с. 84], пры знаёмстве з беларускай народнай казкай “Два маразы” [2, с. 100]. Гэта можа быць шум ветру, завеі, напрыклад, музычны твор П. І. Чайкоўскага “Зіма”.

Музычны твор П. І. Чайкоўскага «Вясна» можна выкарыстоўваць пры вывучэнні вершаў М. Пазнякова “Ландыш” [3, с. 37], Я. Коласа “Песня аб вясне” [3, с. 62], В. Вярбы “Пралеска” [3, с. 67]. Таксама, працуючы з гэтымі вершамі, можна прапанаваць навучэнцам праслухаць журчанне ручая або спевы птушак. Гэта дапаможа развіваць уменне заўважаць прыгажосць прыроды кожнай пары года, фарміраваць уважлівыя і беражлівыя адносіны да яе.

Таксама ў 2 класе ў вучэбным дапаможніку навучэнцам прапануецца пазнаёміцца з беларускай народнай песняй “Ох, і сеяла Ульяніца лянок” [2, с. 31]. Настаўнік можа выкарыстоўваць вучэбны дапаможнік па музыцы, які ўключае шэраг кампазітарскіх і народных твораў, што ўваходзяць у спіс музычнага матэрыялу і ўяўляюць сабой аснову для фарміравання музычнай культуры асобы. Напрыклад: “Ляцелі гусанькі”, “Саўка ды Грышка” [4]. Слухаючы музычныя творы, школьнікі вучацца апісваць характар герояў вусна і пісьмова. Выкарыстоўваючы музыку на ўроках літаратурнага чытання настаўнік выхоўвае цікавасць як да мастацкага твора, так і да музычнага.

Музычны твор прымусіць вучняў глыбей задумвацца над зместам літаратурнага твора, што спрыяе зносінам малодшых школьнікаў.

Музычны твор, які суправаджае чытанне мастацкага твора, дапамагае стварыць адпаведны эмацыянальны настрой вучняў класа. Для вучняў музычны твор робіць мастацкія вобразы больш даступнымі, зразумелымі, вобразнымі і яркімі.

Такім чынам, уплыў музыкі на ўспрыманне твора і авалоданне яго зместам малодшымі школьнікамі на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе з'яўляецца бясспрэчным. Музычны твор дазваляе разнастаіць аналіз твора, дапамагае далучыць школьнікаў да таямніц творчага працэсу, актывізаваць пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, развіваць іх творчыя здольнасці. На сучасным уроку літаратурнага чытання неабходна выкарыстоўваць новыя формы і метады навучання, якія, абапіраючыся на мастацтва, здольныя выхаваць высокадухоўную, маральную асобу. У сувязі з гэтым і з'явілася неабходнасць інтэгравання літаратуры і музычнага мастацтва, бо іх узаемадапаўненне садзейнічае больш глыбокаму раскрыццю мастацкага вобраза перад навучэнцамі.

На ўроках літаратурнага чытання значнае месца адводзіцца творчым работам. У сучаснай методыцы існуе вялікая колькасць відаў і разнавіднасцяў творчых работ. Асноўнымі з'яўляюцца ілюстраванне і драматызацыя. Яны выкарыстоўваюцца ў сувязі з вывучэннем мастацкага твора, бо твор выступае ў якасці асновы творчай працы. Важнае месца ў развіцці творчых здольнасцей вучняў займаюць музычныя творы. Ілюстраванне, драматызацыя і музыка дапамогуць малодшым школьнікам лепш зразумець аўтарскую ідэю, засвоіць характар героя, актывізаваць пазнавальную дзейнасць і развіваць творчыя здольнасці вучняў. Яны спрыяюць глыбейшаму ўспрыманню мастацкага твора, а значыць, з'яўляюцца неабходным сродкам развіцця творчых здольнасцей вучняў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Крук, Б. А. Беларуская песня на ўроках літаратурнага і пазакласнага чытання і яе роля ва ўспрыманні рэчаіснасці і маральна-этычным выхаванні вучняў / Б. А. Крук // Дзіцячы сад – пачатковая школа : праблемы пераемнасці, навучання і выхавання : матэрыялы VII Міжнар. навук.-практ. канф., г. Мазыр, 21 – 22 кастр. 2010 г. / УА МДПУ імя І. П. Шамякіна; рэдкал.: Б. А. Крук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мазыр, 2010. – С. 96 – 97.

2. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне: вуч. дапаможнік для 2 класа ўстаноў агул. сяр. адукацыі з руск. мовай навучання / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 1. – 136 с.

3. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне: вуч. дапаможнік для 2 класа ўстаноў агул. сяр. адукацыі з руск. мовай навучання / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 2. – 136 с.

4. Ковалив, В. В. Музыка : учеб.пособие для 2-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : для работы в кл. / В. В. Ковалив, М. Б. Горбунова. – Минск :Пачатковая школа, 2019. – 152 с.

## *КОПИНГ-СТРАТЕГИИ ЛИЧНОСТИ В ЗАВИСИМОСТИ ОТ УРОВНЯ САМОЭФФЕКТИВНОСТИ*

**КУПРАЦЕВИЧ М.А.**

*УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины»*

*г. Гомель, Республика Беларусь*

*shkolnaya7@tut.by*

Аннотация. В статье представлены результаты эмпирического исследования выбора копинг-стратегий личности с разным уровнем самоэффективности. Значимые различия выявлены у респондентов со «средним» и «низким» уровнем самоэффективности по шкале «принятие ответственности». Достоверной связи между выбором копинг-поведения и самоэффективностью не обнаружено.